# ЮЛІЯ ШУРБІНА-КАРАВАЦКАЯ



## Дзве вежы, два ключы

Гарадское фэнтэзі

Шурбіна-Каравацкая Юлія нарадзілася 7 лістапада 1994 года ў Барысаве. Скончыла факультэт журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Піша прозу для дарослых і дзяцей. Пераможца конкурсу маладых літаратараў Саюзнай дзяржавы «Мост дружбы». Лаўрэат Мінскага гарадскога літаратурнага конкурсу, прысвечанага 80-годдзю Вялікай Перамогі савецкага народа над фашысцкай Германіяй. Жыве ў Барысаве, працуе спецыялістам па рэкламе ў гандлёвай сетцы горада. Упершыню ў «Маладосці».

— Так-так, значыцца, ты наш новы юрыст? — Алег Міхайлавіч, дзелавіты і ўкормлены мужчына, узрост якога з першага погляду вызначыць было складана, бадзёра крочыў па вуліцы.— Люблю юрыстаў! Яны заўсёды думаюць, што могуць растлумачыць усё на свеце.

— У гэтым і сэнс нашай прафесіі,— адказаў Андрэй.

Ён, учарашні студэнт, ледзь паспяваў за мужчынам.

— Та-а-ак,— працягнуў Алег Міхайлавіч,— а яшчэ сэнс прафесіі — разумець: некаторыя рэчы не адразу паддаюцца тлумачэнню, у чым ты і пераканаешся.

Ён дзіўна ўсміхнуўся і завярнуў за вугал.

— Нам сюды,— Міхалыч адчыніў празрыстыя дзверы.

— Пошта? — малады чалавек акінуў поглядам невялікае памяшканне з сінімі стойкамі, сталамі і дзвюма касамі, якія схаваліся за шкляной перагародкай.

— Сёмае аддзяленне.

Алег Міхайлавіч кіўнуў супрацоўніцам, тыя ў адказ дзяжурна ўсміхнуліся. Прайшоўшы міма кас, Міхалыч і Андрэй увайшлі ў жалезныя дзверы. Адразу за дзвярыма паказаліся калідоры. Яны пятлялі, пакуль не прывялі да лесвіцы, што сыходзіла ўніз.

— Тыя мілыя паненкі наверсе думаюць, мы тут памяшканне пад склад здымаем,— растлумачыў Міхалыч.

— Заходзяць у госці?

— Куды там! Калі прыйдуць, убачаць звычайны склад і цагляныя сцены — нічога цікавага. Але хіба гэта можна назваць складам?

Хутка паказаліся масіўныя драўляныя дзверы на завесах. На фасадзе віднелася выгравіраванае сонца з бронзавым, крыху пацямнелым ад часу тварам. Вочы яго былі прыкрыты, а промні разыходзіліся ў розныя бакі так, што ныралі за межы

дзвярэй, агінаючы іх з другога боку. Андрэй выцягнуў руку, каб дакрануцца да незвычайнага малюнка, але сонца раптам расплюшчыла вочы і загаварыла:

— Сардэчна запрашаем у аддзел магічных расследаванняў!

Паказаўся велізарны кабінет са стэлажамі, заваленымі папкамі, каробкамі і кнігамі. На паркеце пыліўся дыван, уздоўж сцен стаялі сталы, тут жа размясціліся раяль і старое крэсла, абітае аксамітам. Пад столлю цягнуліся вокны, праз якія прабівалася прыглушанае святло.

— Што, студэнт, уражаны? — Міхалыч кінуў паліто на спінку крэсла і сеў за стол.

— Ага,— толькі і змог адказаць Андрэй.

— Зараз вернемся да нашых пытанняў. Магія існуе, і ты гэта ведаеш.

Канешне, Андрэй разумеў: магія ёсць. Ну, як разумеў... Ён не бачыў людзей, якія лятаюць, не меў зносін з духамі і тым больш абсалютна абыякава ставіўся да кантрактаў, падпісаных крывёй. Да дадзенага моманту магія была на перыферыі рэальнасці, а цяпер Андрэй стаяў у дзіўным кабінеце, размаўляў з драўлянымі дзвярыма і збіраўся некалькі гадоў свайго жыцця аддаць на магічныя справы.

Алег Міхайлавіч працягваў:

— Вось горад Барысаў,— ён шырока развёў рукі, нібы спрабаваў ахапіць усю прастору.— І ў ім цячэ магія. А дзе магія, там пастаянна блытаніна. Наша справа — тую блытаніну звесці да нуля.

— Магія толькі ў гэтым месцы? Ці яна ўсюды цячэ?

— Не ўсюды. Ты знакі на гербе Барысава бачыў? Дзве вежы, два ключы. І яно нездарма. Дзве вежы — сімвал дзвюх рэальнасцяў: людской і магічнай. Адсюль вынікае, што мы знаходзімся ў тым месцы, дзе названыя рэальнасці могуць узаемадзейнічаць. Ты пра шматсусветную інтэрпрэтацыю чуў?

Андрэй кіўнуў.

— Дык вось у нас тут, у горадзе, сыходзяцца два светы. Звычайна яны не перасякаюцца, у іх станы розныя. Але часам якая-небудзь сутнасць выходзіць пагуляць на іншы бок.

Алег Міхайлавіч выцягнуў з кішэні прадмет, падобны на стары наручны гадзіннік. Замест аднаго цыферблата на гадзінніку было тры.

— Міжпрасторавы компас, па-іншаму — ключ светаў. З яго дапамогай ты можаш апынуцца то ў адной рэальнасці, то ў іншай, вось тут два ніжнія цыферблаты. А гэты,— Алег Міхайлавіч ткнуў пальцам у верхнюю шкалу,— паказвае на разбежку ў градусах паміж светамі. Калі градус зрушаны, значыць, недзе ўтварылася прасторавая дзірка. Чым шырэй градус, тым больш умоўных «дзірак» можа ўтварыцца ў розных месцах. А калі ёсць разрыў, яго трэба ліквідаваць.

— І як тое зрабіць?

— У нас ёсць спецыяліст. Ён гэтыя прасторавыя дзіркі латае так, што і шыўкоў не відаць.

— А-а-а,— працягнуў Андрэй, але насамрэч ён яшчэ нічога не разумеў.

Раптам пачуўся ляскат, адразу за ім — трэск і гудзенне. Алег Міхайлавіч і Андрэй адначасова павярнулі галовы. З невялікай жалезнай скрыні, якая стаяла ў куце, павольна выпаўзала стужка.

— Здаецца, у нас тут справа,— Міхалыч пацёр рукі і абарваў кавалак паперы.

— Што гэта? — спытаў Андрэй, паказваючы на скрыню.

Міхалыч, не адрываючы погляду ад тэксту, адказаў:

— Тэлеграф.

— Пачакайце, ён працуе?

— Вядома! Мы атрымліваем усю важную інфармацыю з дапамогай тэлеграфа. Тут захавалася старажытная лінія.

— А чаму не выкарыстоўваць інтэрнэт ці тэлефон?

— Андрэй, мы ў магічным аддзеле! У нас усё па-сапраўднаму, па-старому, у лепшых традыцыях. Ніякага сачэння, вірусаў ці праграм-шпіёнаў!

Учарашні студэнт засмяяўся:

— І што пішуць?

— На аўтамабільным мосце праз Бярэзіну знік чалавек,— Міхалыч скамячыў стужку і засунуў яе ў кішэню.— Паехалі, трэба пазнаёміцца са справай.

# АЛЯКСЕЙ ГЕРМАН



## Любіць цябе не забаронена

Вершы

Герман Аляксей нарадзіўся 5 чэрвеня 2000 года ў вёсцы Забрэззе Валожынскага раёна Мінскай вобласці. Скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў. Піша вершы. Удзельнік народнага калектыву літаратурна-мастацкага майстэрства «РУНЬ». Творы друкаваліся ў раённай газеце «Працоўная Слава» і штотыднёвіку «Літаратура і мастацтва», у зборніках «Слова Купалы да творчасці кліча» і «Ад каранёў да кроны», альманахах «Сябрына» і «Метамарфозы». Упершыню ў «Маладосці».

### Адбітак кахання

Чырвоныя кроплі зляцелі
У вечную цемень бяды.
Няўжо мы з табою хацелі
Пакінуць такія сляды?

Праз мукі і боль перажыты
Да раю ляцела душа.
У светлай царкве старажытнай
Гучала святая імша.

Упалі на твар мармуровы
Пралітыя слёзы твае.
Даруй мне за крыўдныя словы,
Даруй за правіны мае.

Адбітак былога кахання
У сэрцы агменем пячэ.
З надзеяй чакаю спаткання,
Каб выцерці слёзы з вачэй.

### Пакаянне

Душа шукала адпачынку.
Па свеце птушкаю ляцела.
Адчуць спакой хоць на хвілінку,
Нясцерпны боль забыць хацела.

Мінала цёплыя краіны,
Пустыні, моры, акіяны,
Пасля прыгожыя даліны,
Абшары з подыхам духмяным.

Свой шлях спыніла незнаёмка
Каля святыні каталіцкай.
Зрабіла першы крок няёмка
І стала ціхенька маліцца.

Жыццё вандроўніцу паслала
У цень Аідавага царства.
А споведзь ёй наканавала
Спазнаць Святое Валадарства.

# МАРЫЯ АНАНЬЕВА




## Жах і Бессмяротнасць

Нарысы


Ананьева Марыя нарадзілася 8 красавіка 2007 года ў Мінску. Скончыла ДУА «Гімназія № 174 г. Мінска». Лаўрэат Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу «БрамаМар» імя У. А. Капцава. Цяпер абітурыент. Літаратурны дэбют у «Маладосці».


Пра двух проста складаных
або складана простых людзей

### Уступ

— Ты мяне чуеш?..

Маланка мільганула ў небе, і невысокі сілуэт паказаўся з-за прыгорка. На самай справе прыгоркам для дваццацігадовага юнака Сашкі здаваўся невялікі кавалак дарогі, які прывёў хлопца ў лес.

— Чаго ты крычыш? — пачуўся раздражнёны голас цёмнавалосага маладога чалавека. Ён з'явіўся нібы з ніадкуль. Але выйшаў з-за прыгорка — так уяўляў сабе Сашка.

— Ты мяне чуеш? — спакайней спытаў юнак.

— Чую, чую, пабеглі ўжо.

— Антон, чаму ты такі? — Сашка зрабіў некалькі крокаў і зноў спыніўся. Таварыш нядобра на яго зыркнуў.

— Які? Чэрствы? Складаны? Дзякуй богу, я не адчуваю так многа эмоцый у адзін момант! Магу не думаць пра ўсё і пра ўсіх. Я бессмяротны, разумееш?

На яго твары з'явілася ўсмешка. Антон пабег зноў. Сашка, паправіўшы доўгія валасы, завязаныя ў хвост,— за ім.

Іх празвалі Жах і Бессмяротнасць. Сашка ніколі не перастае думаць, і часта гэткія думкі пужаюць яго. Але талентаў у хлопца яшчэ больш, чым думак. Таму ён жах: ніхто больш не зможа так хаваць свае таленты.

Сямнаццацігадовы Антон не з тых, хто будзе пужацца думак сябра. Ён проста будзе стаяць, сядзець, бегчы — няважна — каля яго і ўслухоўвацца ў кожнае слова. Ён ніколі не зможа марыць аб такіх падзеях, як Сашка, ды і таленту ў яго няма. Ёсць бессмяротнасць і адвага.

Чаму яны сталі сябрамі? Чаму беглі праз лес? Можа, гэта была іх апошняя сустрэча.

А можа, яны паедуць яшчэ не на адны спаборніцтвы. Тое вядома толькі Сашку. А Антон даведаецца ад яго.

## Дзвіна сёння хуткая Сашка

Калі Антон пабег далёка і знік з поля зроку, я паглядзеў на неба. Яно выбівалася праз кроны дрэў, такое цёмнае ліпеньскае неба.

Гэта нібы ўсе мае думкі перабраліся туды і пачалі клапаціцца пра нейкія свае турботы. Быццам я зноў аказаўся на беразе хуткай ракі Дзвіны, дзе ў сем гадоў упершыню ўбачыў грабцоў.

Я матнуў галавой і паскорыўся: Антон невядома куды падзеўся. Сцежка была прамая, роўная, як паласа, і толькі аднойчы раздзялялася. Адна яе частка ішла далей у лес, а другая прыводзіла такіх хлопцаў, як мы, да ракі.

Я спадзяваўся, што Антон пабег менавіта да ракі. І не памыліўся.

Ён чакаў мяне каля старога прычала, дзе аднойчы кожны з нас узяў у рукі вёслы. Грэбля стала для нас абодвух не проста заняткам, а домам, сям'ёй — жыццём.

— А Дзвіна сёння хуткая,— ціха прамовіў Антон і нахіліўся да вады. Грымнуў гром. Зноў мы ўбачылі маланку.

— Памятаеш, як мы па такой вадзе плылі? Табе, пэўна, чатырнаццаць было…

Я сказаў нешта яшчэ, але сам сябе не пачуў: моцны вецер з'еў мае словы. Антон нават не звярнуў на гэта ўвагу.

Ён толькі падышоў да мяне і паправіў мае растрапаныя валасы.

— Пастрыгіся ўжо! — таварыш трохі ўсміхнуўся.— Як табе толькі валасы не перашкаджаюць?

— Ніколі не пазбаўлюся іх,— ціха адказаў я.— Яны захавалі ў сабе памяць. І, гледзячы на іх, успамінаю яе.

— Каго? Юлю? — Антон скрывіўся.

— Ты не ведаеш яе так добра, як я,— крыўдна не было, але нешта ёкнула ў сэрцы.— Яна неверагодная.

— Веру,— уздыхнуў ён і зноў пачаў углядацца ў хуткую Дзвіну. Вада несла ў сабе галінкі, лісцікі і кветачкі, а таксама цемру неба і неспакойны свет сонейка, што выбівалася праз хмары.

Турботы пазабыліся ўмомант. Антон уздыхнуў і адчуў, як яму на плячо лягла рука. А я толькі дрыжаў і саромеўся сваіх пачуццяў.

— Кім была Юля? — нарэшце спытаўся сябра.

— Яна была маім цяплом і светам. Нібы сонейка, якое распаліла ўва мне агеньчык. Без яе не ведаў, што рабіць далей,— не задумаўшыся адказаў я.

— А зараз? — Антон паправіў русыя валасы.

— Зараз яна… яна таксама сонейка, якое жыве ў мяне ў грудзях.

Таварыш углядаўся мне ў вочы. Я ўглядаўся ў яго. Бачыў толькі шэрыя адцені — тое, што засталося ад пачуццяў. Але яны ззялі. Ён проста не ведаў, як паказаць сваю зацікаўленасць.

Я не сумняваўся: Антон бачыць мае зялёныя вочы і ні аб чым не думае. Ён не аднойчы мне гаварыў: унутры ў мяне хаваецца д'ябал. І я ведаю: у гэтыя словы былі ўкладзены ўсе яго пачуцці. Жах — яны засталіся ў мяне ў памяці.

Ён такі. Я яго не змяню. Ён бессмяротны. І сэрца ў яго, на жаль, толькі б'ецца, а не гарыць адкрытым полымем.

## А што далей? Антон

Ён мяне ўратаваў. Я нічога болей не магу сказаць пра Сашку. Гэты хлопец, старэйшы на тры гады, трошкі ганарлівы і шумны — а так нечым мяне зачапіў.

Седзячы на беразе Дзвіны, мы пачалі размаўляць пра яго першае каханне. Я нічога не ведаю пра гэта: як яно бывае, што павінны рабіць закаханыя. Сам я ніколі не зведваў тое пачуццё і яго не бачыў.

Сашка ўглядаўся ў неба і аб нечым марыў. Пачаў капаць дробны дожджык.

# У прасторы, у часе, у сэрцы

## Юлія Голубева



(г. Віцебск)

### Май над Дзвіной

Пышнагруды бэз зноў набірае сілу,
Хоць ноччу падмярзае цвет яго.
Люстра Дзвіны блішчыць пад небасхілам.
На воды сонца золатам лягло.
Капрызны май! Капрызнае надвор'е!
То вабіць цеплынёй і харaством,
То сіверам гуляе ў завуголлі,
Дрыжыць марудным ранішнім дажджом.
Сярод бяроз у скверыку знаёмым,
Бадзёрыя, снуюць паўсюль шпачкі.
Схаваліся ў квецені маёвай
Танюткія пялёсткі-матылькі.
І што прыпыніць ў гэты час імкненне
Кахаць і жыць з расхінутай душой?
Махрысты бэз пачаў сваё цвіценне
У аксамітным ранку над Дзвіной!

### Адпусці мяне, боль

Адпусці мяне, боль, не трымай.
Праляці над палямі роснымі,
Адыдзі ў халодны май,
Растапіся ільдамі слёзнымі.
Пранясіся ты над зямлёй
Птушкай белаю, моцнакрылаю!
Адцвіці краскай лугавой
Над надзеяй маёй спачылаю.
Хай адродзіцца у святле
Новых мар, новых дум сцяжынача.
Адпусці мяне, боль. Але...

След твой бачны на цьмяным шкле —
Не адпусціць душа цябе.

## Ангеліна Ганчарова



(г. Гомель)

### Думкі пра Балі

Зараз з'ехала б на Балі есці дурыян,
Каб глядзелі зверху пальмы,
побач — чамадан.
Промні сонца каб у вочы, цела — ў акіян,
Ўдзень — турыст, амаль мясцовы,
уначы — шаман.

Ўспамінаць эфір, мікро, бегаць басанож,
Слухаць песню хваляў толькі
і хадзіць уздоўж...

Ногі кожны дзень ў пяску, ў солі — валасы,
І паветра хай даносіць з працы галасы,
Песні і мелодыі, сола і басы.

Можа, утаймую «л», зноў убачаць вочы.
Мне на поўдзень трэба, людзі!
Штосьпісаць
І моўчкі крочыць.

# ЮРАСЬ ГУЛІЦКІ



## Прамяністыя вечары

Апавяданне

Гуліцкі Юрась (сапр. Сцяпан Сяргей) нарадзіўся 26 мая 1953 года ў вёсцы Шавялі Ляхавіцкага раёна. Скончыў Беларускі політэхнічны інстытут. Працаваў інжынерам у будаўнічых арганізацыях г. Мінска. Аўтар кніг паэзіі «Буслы на ржышчы», «Снежань», кнігі прозы «Човен на рэчцы Геракліта». Жыве ў Мінску.

Чырвоныя ружы на вузкім бакавым століку, за якім сядзела Алёна, прыцягвалі позіркі пасажыраў, што праходзілі міма, адшукваючы свае месцы ў плацкартным вагоне пасажырскага цягніка. Некаторыя, асабліва мужчыны, стараліся зазірнуць у твар жанчыне, усміхаліся, але яна, здавалася, нікога не заўважала, глядзела праз вакно на апусцелы перон, а пальцы машынальна слізгалі па гладкім цэлафане, і толькі калі вострая калючка балюча ўкалола безыменны палец, жанчына злёгку ўздрыгнула і агледзелася наўкола. Насупраць яе на свабоднае месца села маладая дзяўчына, усміхнулася сваёй суседцы, кіўнула ў бок кветак:

— Прыгожыя ружы...

Алёна не адказала, падумала толькі, што іх патрэбна кудысьці прыбраць — не месца ім на вузкім століку. Хацела падняцца, каб пакласці на верхнюю паліцу, але ў гэты час цягнік тарганууся і зрушыўся з месца. Яна прыхілілася тварам да ваконнага шкла, як быццам хацела кагосьці ўбачыць, толькі, акрамя чыгуначніка ў цёмна-сіняй спецвопратцы, які ішоў уздоўж вагонаў, што стаялі на суседнім пуці, і двух маладых хлопцаў з вялікімі сумкамі, на пероне больш нікога не было. «Мог бы і затрымацца на хвілінку,— падумала з лёгкай крыўдай на Максіма.— Калі б і спазніўся на сваю нараду, то, напэўна, з працы не выгналі б...»

Яны пазнаёміліся ў санаторыі. Дзень быў сонечны, цёплы, якія звычайна выпадаюць на пачатак верасня. Алёна толькі што засялілася ў аднамесны нумар, распакавала свае рэчы, зарэгістравалася, атрымала санаторную кніжку, глянула на гадзіннік — да абеду заставалася цэлая гадзіна, і яна вырашыла прагуляцца. Пераапранулася, абула красоўкі і выйшла на вуліцу. Па вымашчаным пліткай ходніку, міма невялікага скверыка, дзе сядзелі на

лаўках адпачываючыя, дайшла да адчыненых варот у металічнай агароджы, за якой узнімаліся высокія хвоі, унізе між імі зелянелі кусты арэшніку, цягнуліся да святла танклявыя бярозкі з лісцем, якое ўжо пачало жаўцець. Алёна на поўныя грудзі ўдыхнула смалісты хвойны пах і па даволі шыракаватай сцяжынцы накіравалася ў глыб лесу. Абапал сцяжыны месцамі чырванелі гронкі арабін, трапяталася пад ледзь улоўным ветрыкам пацямнелая лістота на маладых асінах, і дзесьці зусім побач на высокай хвоі раздаваліся гулкія кароткія стукі дзятла. Яна ўзняла галаву, але птушку не заўважыла, а ўбачыла вавёрку, якая, шпарка перабіраючы лапкамі па заімшэлым камлі, спускалася долу. Насцярожана зыркнула вочкамі на Алёну, на імгненне знерухомела, потым саскочыла на зямлю, але не ўцякала, а, падняўшыся на заднія лапы, зноў паглядвала на жанчыну, як быццам чагосьці чакаючы. Алёна зразумела: вавёрка чакае пачастунку. Відаць, адпачываючыя падкормлівалі яе, і яна пашкадавала, што нічога не мае для прыгожага ляснога звярка.

За паваротам сцежкі хруснула сухая галінка, пачуліся чыесьці крокі. Вавёрка скокнула на суседнюю елку, хуценька ўскарабкалася наверх і схавалася між густых зялёных ялінак. Алёна павярнула галаву і ўбачыла: насустрач ёй ішоў мужчына. Сярэдняга росту, падцягнуты, у блакітным спартыўным касцюме, праз густыя чорныя валасы прабівалася сівізна, але твар з прамым носам і танкаватымі, прыгожа абрысаванымі вуснамі выглядаў маладжавым, і на від яму можна было даць гадоў сорак пяць, не болей. У руках ён трымаў пластыкавую бутэльку з вадою. Параўняўшыся з жанчынай, акінуў яе ўважлівым позіркам, павітаўся:

— Добры дзень.— Потым спытаў: — Вы да крынічкі — папіць вадзічкі?..

Алёна ўсміхнулася на рыфмаванае пытанне незнаёмца, крутнула галавою:

— Не, я проста гуляю,— падняла вочы ўверх: — А вы спалохалі вавёрку — яна схавалася вунь там, на елцы.

— А-а-а... Верачка,— засмяяўся мужчына, перахапіўшы няўцямны позірк Алёны, патлумачыў: — Адпачываючыя яе так празвалі. Прыручылі, прыкармілі, вось яна і круціцца ля сцежкі, чакае гасцінцаў,— сунуў руку ў кішэню, уздыхнуў: — На жаль, у мяне нічога для яе няма...

— У мяне таксама няма, я не ведала, што сустрэну ў лесе прыручаную вавёрку.

— Не перажывайце, у вас яшчэ будзе магчымасць пачаставаць нашу Верачку,— ён зноў усміхнуўся: — Дарэчы, мяне завуць Максім. Ці магу я даведацца ваша імя?

— Алёна,— проста адказала яна.

— Вельмі прыемна, Алёна. Я так разумею, вы нядаўна прыехалі ў санаторый?

— Сёння прыехала, толькі засялілася. Я тут упершыню і вырашыла прайсціся, трошкі агледзецца...

— А я ўжо — старажыл,— засмяяўся,— амаль тыдзень у санаторыі і скажу вам, што мясціны тут прыгожыя: лес, возера, паветра чыстае... Лекаванне ў санаторыі нядрэннае, думаю, не пашкадуеце, што патрапілі сюды, ды яшчэ і ў аксамітны сезон.

Максім глянуў на гадзіннік:

— Праз дваццаць хвілін пачынаецца абед, таму я вам раю, калі не хочаце застацца галоднай, вярнуцца ў санаторый.

Яны пайшлі разам. Максім расказваў ёй пра санаторый, паказваў, дзе ў якім корпусе прымаецца тая ці іншая працэдура. Алёна скоса паглядала на свайго новага знаёмага і раптам падумала, што ён чымсьці падобны да яе аднакласніка, у якога была закаханая ў дзясятым класе. Мінулася амаль дваццаць гадоў з таго часу, а яна так і не забыла свайго Толіка. Памніла той першы нясмелы пацалунак у цёмным садзе, куды яны зайшлі пасля выпускнога балю, тую трывожную радасць з гарчынкай жальбы па школьных гадах, якія так хутка праляцелі... Свяціліся на небе няяркія чэрвеньскія зоркі, пахлі, ледзь бачныя ў прыцемку, чырвоныя півоні, дзесьці ля школы чуліся вясёлыя галасы іхніх аднакласнікаў, а яны, абняўшыся, сядзелі на драўлянай лаўцы, і яе душу перапаўняла прадчуванне нейкага новага, бязмежнага шчасця, якое, здавалася, прыходзіць да яе вось зараз, разам з наступаючым дарос-

# ВАСІЛЬ ДЭБІШ



## Стаю ля мамінай магілы

Вершы

Дэбіш Васіль нарадзіўся 22 ліпеня 1962 года ў вёсцы Шамятоўка Свіслацкага раёна Гродзенскай вобласці. Скончыў Мінскі інстытут культуры (цяпер — Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў). Творы публікаваліся ў рэспубліканскім перыядычным друку і калектыўных зборніках «Дзень паэзіі», «Дзядзінец», «Берасцейскія карані». Аўтар зборнікаў вершаў «Белыя птахі», «Лісты да Марыі», «Праз дождж», «Чуйнар», «Белабог», «Пушчанскія дзівы». Жыве і працуе ў Брэсце.

✦ ✦ ✦

Стаю ля мамінай магілы.
Жыла тут. Божаньку маліла,
Каб не было вайны. Высока
Кружляе бусел, адзінокі.
Ляці! Хай Бог дасць волі, сілы...
Стаю ля мамінай магілы.

✦ ✦ ✦

Гарыць сланечнік, нібы сонца.
Пад бэрай яблыкаў заліў.
Прамень разрэзаў ціш ваконца,
Святлом ігрыстым запаліў.

Што будзе заўтра, я не знаю.
Сталею. Голас мой дрыжыць.
У лесе ўсё радзей бываю.
І плечы кроквяў — у іржы.

Але было! Ніякіх стратаў,
Дзяцінства дух на ложку спіць.
Літоўку адбівае тата,
На ганку мамачка стаіць.

Вунь шэрая, з-пад бульбы, яма,
Счарнелы сад і хлеў стары.
Не адыходзь у Вечнасць, мама!
Сланечнік, сонейкам гары.

✦ ✦ ✦

Дзяцінства зноў успомнілася мне.
Плыве туман над рэчкай кучаравы.
Буслінае гняздзечка на гумне
І ў белых росах лугавыя травы.

А ліпы пазіраюць на людзей
Так велічна, нібы пасланцы Бога.
Да Храма мяне мамачка вядзе,
Руку не адпускаючы малога.

Крыжы святлом напоўнілі абшар,
Званы уцехай сэрца агарнулі.

І да Хрыста спяшаецца душа
З спакойнаю малітваю матулі.

Прыйшлі. Ступні Хрыста цалуеш ты.
Укленчыла — упала на падлогу.
А храм мне здаўся ціхім і пустым,
І мамінага там не ўбачыў Бога.

Ён БЫЎ — нібы падземная рака.
І верай стаў, маёй надзеяй, ХРАМАМ...
Хоць цэлы свет акажацца ў руках —
Нішто на свеце не заменіць МАМУ.

✦ ✦ ✦

Мне б, мамачка, да рук тваіх
Прыпасці, да каленяў.
Не свеціць сонца. Вецер сціх.
І знічкамі імгненні.

Самотна без цябе, павер,
Не ведаю, як выжыць...
Дзе мамін позірк? Ён цяпер
У Вечнасці. Ля крыжа.

✦ ✦ ✦

Не спіцца нешта гэтай ноччу зноў.
На засаўку зачыненыя дзверы.
Ледзь чутны стук. Хто гэта тут прыйшоў?
У дамавых даўно ўжо я не веру.

Устаў. За шыбай знічак прамяні.
«Сыночак, ты сягоння ці абедаў?
Я знаю, што ты ў хаце, адчыні,
Не бойся, я прыйшла цябе праведаць».

Ключ скрыгатнуў. Пачуў матулін крок,
І голас прагучаў: «Як ты далёка.
Цябе люблю, мой родненькі сынок,
Мне страшна без цябе і адзінока».

Пад хусткай гладзь ссівелых валасоў,
А ў мілых зрэнках — стома і пяшчота.
«Хварэла цяжка я, а ты не йшоў,
Заняты быў сям'ёю і работай».

Усміхнулася. За плечы абняла,
Заплакала. І руку мне цалуе.
«З табою я шчасліваю была.
Бывай сынок, я ўсё табе дарую».

Прапала раптам. Енчы ці маўчы —
Не дапаможаш, будзь ты хоць са сталі.
Пайшла. У незямную далячынь.
У цемры ночы нема зоркі ззялі.

✦ ✦ ✦

Уславім нашых мам. У цяжкі час,
Як боль пякельны працінае цела,
Яны нябачна моляцца за нас,
Каб менш мы бедавалі і хварэлі.

Калі наступіць паласа няўдач,
Імкнемся гора пераняць слязамі,
За спінамі мы чуем горкі плач —
Яны нязменна плачуць разам з намі.

Калі нядолі як і не было,
Калі нас паважаюць і кахаюць,
На сцежцы ловім дрогкае святло —
Для нас яны дарогу асвятляюць.

На жаль, на свеце гэтым кожны госць.
Імгненнем век на свеце чалавечы.
Любіце мам, пакуль яны ў вас ёсць,
Каб не давіў цяжар віны на плечы.

✦ ✦ ✦

Пахіліла нізка ружа голле
І чырвоным не палае кветам.
Мама, мама, ці туман у полі,
Ці твае няспраўджаныя леты.

На буслянцы птушкі гнёзды ладзяць —
Спеў не цешыць сэрца, не чаруе.
Мама, мама, ці вятрыска ў садзе,
Ці па долі голас твой сумуе.

На світанні на дарогу выйшаў:
На усім адбітак золкай ночы.
Мама, мама, мне падобны высі
На твае зажураныя вочы.

І чаму вясной мярцвее голле,
І куды падзелася крыніца,
Што паіла нас?.. Туман у полі.
І ад ветру мне не затуліцца.

# СЯРГЕЙ БЕЛАЯР



## Трыбунальская Інстыгаторыя[1]

Цыкл фантастычных апавяданняў

Белаяр Сяргей нарадзіўся 19 красавіка 1978 года ў Брэсце. Скончыў гістарычны факультэт Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Друкаваўся ў беларускай і замежнай літаратурна-мастацкай перыёдыцы. Аўтар зборніка фантастычных апавяданняў «Щит Персея» і зборніка навукова-фантастычных апавяданняў «Расследаванні інспектара Сарвы». Дыпламант Брэсцкага абласнога літаратурнага конкурсу «Мы рождены для вдохновения» (2011), конкурсу апавяданняў газеты «Звязда» (2018), рэспубліканскага конкурсу фантастычнага апавядання, арганізаванага секцыяй прыгодніцкай і дэтэктыўнай літаратуры ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» (2021) і інш. Пераможца конкурсу фантастычных апавяданняў выдавецтва «Новая реальность» (Масква, 2014). Лаўрэат літаратурнай прэміі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта імя Уладзіміра Калесніка (2019).

### Барацьба за існаванне

Барацьба за існаванне, якая нічога не дае, лічыцца ідэйнай.

*Дон-Амінада (Амінад Пятровіч Шпалянскі) (1888—1957)*

Таварыш дазволіў біноклю павіснуць на скуранай папрузе на грудзях і хуткім крокам накіраваўся да шкляра.

— Спадар Каган?

— Знайшоў, спадар Рынг! — Шкляра перапаўнялі эмоцыі.— Там!

— Вы дазволіце, васпан? — Таварыш заняў месца Кагана і паглядзеў у паказаным ім напрамку, ловячы сябе на тым, што трымае руку на рукаяці рэвальвера Прайса. Праз тузін метраў ад дарогі, ля разгалістай ліпы, чарнела пляма, якая нагадвала сваёй формай Amoeba proteus.

Абсалютна чорнае цела, калі карыстацца тэрмінам Густава Роберта Кірхгафа.

— Спадарыня Дайнова,— павярнуўся на шум Рынг,— калі ласка, перадайце спадару Палюту, хай зніжаецца.

— Рэй!

Паравому дырыжаблю прыйшлося завіснуць над дарогай — прабрацца скрозь галіны соснаў не прадстаўлялася магчымым. Шчанюк, успрымаючы мітусню як пачатак вясёлай гульні, толькі зараз пакінуў ляжанку. Дайманлабан па-ранейшаму маўчаў.

— Шаноўнае спадарства, прашу вас не забываць пра асцярожнасць,— нагадаў таварыш, перш чым Польны почат наблізіўся да анамаліі. Пляма мела памеры тры на чатыры метры і аддалена нагадвала

[1] Працяг. Пачатак у №№ 5, 10 за 2022 год, № 11 за 2023 год, № 5 за 2024 год.

фульгурыт — аплаўлены ўдарам маланкі дыяксід крэмнію.

— Цікава, наколькі глыбока akratoterm goes... сыходзіць у зямлю? — Англічанін нямоцна пастукаў кіем-шпагай па анамаліі. Тая адгукнулася характэрным шкляным гукам. Ні адзін адростак не адламіўся.— Ніякіх extraneous inclusions...

— Старонніх уключэнняў.

— Thank you, міс Дайнова... Homogeneous and monolithic mass... er...— Робертсан зноў запнуўся.

— Аднастайная і суцэльная маса,— падказала пачэтавая. Англічанін удзячна кіўнуў.

Ганчаку нарватвор здаўся цікавым, і ён мякка дакрануўся да яго лапай, а затым гаўкнуў, збянтэжаны.

— Не, Дэмарх, мы не ведаем, што гэта такое,— прамовіла Дайнова.

— Спадар Мамут, папрашу вас прынесці фатаграфічны апарат,— сказаў Рынг.— Спадар Цыкра, нам спатрэбяцца хімічныя рэактывы. Возьмеце ў спадара Палюты кайло.

— Рэй! — адказалі пачэтавыя і сышлі.

Робертсан падрыхтаваўся рабіць запісы, а таварыш, прысеўшы над анамаліяй, сцягнуў пальчатку і дакрануўся да наплыву рукой. Адчуванні тыя ж, як пры дотыку да шкла.

— Тут хтосьці ўжо has visited... пабываў да нас, sir,— англічанін кіем-шпагай паказаў на каменную мешаніну вакол самай доўгай «ілжэножкі».

— Язычнікі надзялялі «грымотныя стрэлы» магічнымі ўласцівасцямі,— патлумачыла пачэтавая.— Дазволю сабе нагадаць, джэнтльмены, што, па народных павер'ях, «стрѣлкы громніи» адпужвалі дэманаў і дазвалялі адолець ворага, а таксама валодалі лячэбнымі ўласцівасцямі. Шанаванне фульгурытаў, нягледзячы на актыўнае супрацьдзеянне іўдзее-хрысціянства, жывое да гэтага часу.

— Superstitions are ineradicable... забабоны вечныя,— выдыхнуў Робертсан.

Лекар вярнуўся раней, чым павінен быў. І з пустымі рукамі. Здагадацца, чым гэта абумоўлена, не выклікала цяжкасці.

— Тэлеграма з Канцылярыі Вялікалітоўскага Інстыгатара, спадар Рынг.

Таварыш узяў папяровую стужку і прачытаў:

— Польнаму почату загадана неадкладна накіравацца ў Чырвоную царкву. Магчымы прарыў Цемры ў Музеі прыроднай гісторыі.

— У Grand Duchy of Lithuania таксама маецца Museum of Natural History? — прыемна здзівіўся англічанін.

— І паўстаў ён яшчэ ў тысяча восемсот шэсцьдзясят шостым годзе, за два з паловай гады да ўзнікнення American Museum of Natural History ў Манхэтэне,— не без гонару сказала Дайнова.

— Шаноўнае спадарства, прашу ўсіх на борт! — Рынг нацягнуў пальчатку і першым пайшоў да дырыжабля, цешачы сябе думкай, што анамалія нікуды ад почату не дзенецца. Калі ўжо захавалася на працягу паўтара года, пачакае і яшчэ некалькі гадзін.— Спадар Каган, мы высадзім вас побач з Гаштольдамі.

Чырвоная царква, дзе стараннямі Дамініка Альбрэхта Радзівіла і яго жонкі Крысціны Ягелонкі быў пабудаваны музей, стаяла ад акрататэрма на трыццаць дзевяць з невялікім кіламетраў.

— Экіпіруемся! — Механік выціскаў з паравой машыны максімум, так што да музея вынікала прыбыць у поўным узбраенні.

Пасля таго, як Мамут распавёў почату пра тое, што бачыць будынак, пачэтавыя з біноклямі прыпалі да ілюмінатараў.

Музей прыроднай гісторыі спалучаў у сабе элементы неаготыкі і неарэнесансу з сучаснымі інжынернымі рашэннямі, разведзенымі мясцовым каларытам. Нягледзячы на разбурэнні, будынак уражваў.

— Аддаю належнае to the ἀρχιτέκτων, architect — ваш museum, ladies and gentlemen, выглядае incomparably better...

— Непараўнальна лепш, спадар Робертсан.

— Thank you, міс Дайнова... непараўнальна лепш за лонданскі Ally Pally — палац Аляксандры.

Таварыш напружыўся, аднак хутка высветлілася: незадаволенасць Дэмар-

ТАМАРА АЎСЯННІКАВА

# «Знайсці траву сваю гаючую...»

Магілёўшчына славіцца сваімі таленавітымі паэтамі. Тут нарадзіліся Аркадзь Куляшоў, Аляксей Пысін, Сцяпан Гаўрусёў, Міхась Стральцоў, Анатоль Сербантовіч, Алесь Пісьмянкоў, Іван Бурсаў, Ігар Шклярэўскі...

Ігар Іванавіч Шклярэўскі нарадзіўся 25 чэрвеня 1938 года ў Бялынічах. Пасля вайны сям'я жыла ў Магілёве. У 1946 годзе Ігар паступіў у першы клас Магілёўскай мужчынскай агульнаадукацыйнай школы (зараз гімназія № 3), якую скончыў у 1956 годзе. Тут хачу звярнуць увагу на той факт, што ва ўсіх беларускіх даведніках змешчана памылковая інфармацыя пра тое, што Ігар Шклярэўскі скончыў Бялыніцкую сярэднюю школу.

У алфавітнай кнізе Магілёўскай навучальнай установы насупраць імя Ігара Шклярэўскага запісана: ***«Год поступления 1946. Выбыл 24.06.1956, окончил 10 Б класс, получил аттестат зрелости».*** Там і хатні адрас, які, як высветлілася, недакладны. Устанавіць фактычнае месца пражывання паэта было не вельмі складана, бо дом, у якім прайшлі школьныя гады Ігара, усім вядомы як дом Будзённага, знаходзіцца ў цэнтры горада побач з кінатэатрам «Радзіма». Пабудаваны быў у 1934 годзе і ў час вайны ацалеў.

Выпускніца агульнаадукацыйнай школы № 3 Ірына Бондарава дапамагла мне сустрэцца са старажыламі дома Будзённага, 15/34 Інай Іванаўнай Дзіваковай (кв. 33) і Людмілай Вітальеўнай Баграцовай (кв. 40). Яны не былі блізка знаёмыя з сям'ёй Шклярэўскіх, але ведаюць, што сям'я паэта жыла ў 4-м пад'ездзе на другім паверсе ў трохпакаёвай кватэры № 27. Іна Іванаўна і Людміла Вітальеўна добра помняць Ігара і яго брата Алега, помняць, як да Шклярэўскіх прыязджаў з Амерыкі пісьменнік Міхаіл Шумаў, які разам з Ігарам хадзіў на рыбалку. Іна Іванаўна прадэкламавала радкі Ігара Шклярэўскага, якія



Злева сядзіць бацька, стаяць Алег і Ігар Шклярэўскія



Двор, у якім вырас паэт

цытавалі амаль усе жыхары дома ў канцы 1950-х — пачатку 1960-х гадоў:

«Поэт махнул на целину,
Читатели сказали: «Ну!»
Поэт вернулся с целины
И хоть бы хны».

Людміла Вітальеўна лічыць набходным устанавіць мемарыяльную дошку на доме, бо амаль штодня ў іх двор водзяць экскурсіі, каб паказаць тульскі самавар, але ні разу яна не чула, каб хто з экскурсаводаў узгадаў, што ў гэтым доме жылі паэт Ігар Шклярэўскі і аператар і рэжысёр Алег Шклярэўскі.

Маці паэта, Ксенія Аляксандраўна, у дзявоцтве Марготкіна (1905—1988),— заслужаны настаўнік, працавала ў СШ № 1 г. Магілёва настаўніцай пачатковых класаў.

Бацька, Іван Іванавіч (1889—1978), — настаўнік гісторыі. Удзельнік Першай сусветнай вайны. У час Другой сусветнай, хутчэй за ўсё, не прызываўся па прычыне ўзросту. З аўтабіяграфіі сына Алега ад 03.10.1966 г. стала вядома, што Іван Іванавіч Шклярэўскі доўгі час працаваў у Магілёўскім абкаме партыі.

Па словах Наталлі Куляшковай, якая збірала матэрыялы па гісторыіі гімназіі № 3, Ксенія Аляксандраўна і Іван Іванавіч карысталіся вялікай павагай аднакласнікаў і сяброў Ігара і Алега. У іх доме часта бываў Валерый Раеўскі (1939—2011) — будучы беларускі тэатральны рэжысёр, народны артыст Беларусі, які таксама вучыўся ў агульнаадукацыйнай школе № 3.

Ігар Шклярэўскі пасля школы паступіў у Магілёўскі педагагічны інстытут, але не скончыў яго. Больш перспектыўным будучаму паэту бачыўся Літаратурны інстытут імя А. М. Горкага. Дзякуючы архіўнай даведцы з Літаратурнага інстытута за № 1/25а ад 03.03.2025 г., атрыманай ад Марыі Алегаўны Шклярэўскай, дакладна вядома, што Ігар Іванавіч быў залічаны на завочнае аддзяленне з 1 верасня 1960 года (загад № 17 ад 31.08.1960 г.); з 26.09.1963 г. пераведзены на дзённае аддзяленне (загад № 169 ад 26.09.1963 г.), а з 5 курса (загад № 12 ад 13.01.1967 г.) адлічаны з інстытута. Прычына не ўказана.

Сёння хачу ўзгадаць Ігара Іванавіча Шклярэўскага і тых землякоў, з якімі ён падтрымліваў зносіны. Перш-наперш гэта Ізяслаў Катляроў (1938—2023). Ад вернай спадарожніцы Ізяслава Рыгоравіча, паэткі Соф'і Шах, я атрымала два здымкі і копіі двух дарчых подпісаў на кнігах «Лодка» і «Неназванная сила»:

*«Изяславу Котлярову!*
*Всё, что уходит, — остаётся,*
*Лишь именем другим зовётся.*
*Всё, что пропало без следа, —*
*Осталось в жизни навсегда.*

*Будь здоров и не сдавайся.*
*9/IV-77 г. Игорь Шкляревский»;*




Ігар Шклярэўскі ў верхнім радзе трэці справа

*«Талантливому и чистому другу моей юности Изяславу Котлярову — найти силы, найти траву свою целебную. С любовью — Игорь Шкляревский. 14/II-1980 г.».*

Ізяслаў Катляроў у юбілейным артыкуле «Поэт непостижимой простоты» («Нёман», 6/2018) успамінае, як халодны восеньскі дождж аднойчы прымусіў іх схавацца ў Магілёўскай абласной бібліятэцы. Праз шкляныя дзверы залы яны ўбачылі Аляксея Пысіна, Васіля Матэвушава і Пятра Шасцерыкова. Зайшлі. Не паспелі яшчэ прысесці, як Аляксей Васільевіч аб'явіў: «А вось і нашы маладыя паэты» — і даў слова Шклярэўскаму.

У музейным пакоі абласной бібліятэкі захоўваецца кніга Ігара Іванавіча «Воля» з дарчым подпісам Аляксею Пысіну:

*«Дорогой Алексей!*
*Люблю твою поэзию от души.*
*«Выходи» на пенсию и пиши!*
*23/V-73 г. Игорь Шкляревский».*

Зварот на «ты» да прызнанага паэта, старэйшага на васямнаццаць гадоў, гаворыць пра блізкія, даверлівыя адносіны між імі.

Шклярэўскі сябраваў з доктарам-рэнтгенолагам Магілёўскага абласнога анкалагічнага дыспансера Нафтолем Фарберам (1926—1988). Пазнаёміўся Ігар Іванавіч з ім, калі ўзніклі праблемы са здароўем. У сямейным архіве дачкі Нафтоля Фарбера Аляксандры Пронькінай беражліва захоўваецца сем кніг з дарчымі подпісамі.

Першы — на кнізе «Фортуна»: *«Замечательному рентгенологу Н. Х. Фарберу, который видит меня насквозь! С уважением и благодарностью И. Шкляревский. 21/VIII-70 г.».*

На кнізе «Воля»: *«Прекрасному рентгенологу и благородному другу Нафтолю Фарберу с любовью. Игорь Шкляревский. 6/I-73 г.».*

На кнізе «Ревность»: *«Моему благородному другу Нафтолю с братской нежностью. Игорь Шкляревский. 26/IV-74».*

На кнізе «Дозорная ветка»: *«Нафтолю Фарберу — талантливому врачу, благородному другу — бодрости, радости, жизнестойкости! С нежностью — Игорь Шкляревский. 24/IV-75 г.».*

На кнізе «Похолоданье»: *«Мужественному Нафтолю Фарберу — лучшему человеку этого города. С нежностью — Игорь Шкляревский. 6/II.76 г.».*

На кнізе «Тень птицы»: *«Дорогому Нафтолю — грибной осени и никаких теней на лице! Нежно — Игорь Шкляревский. 31/VIII-76 г.».*

Апошні дарчы подпіс — на кнізе «Неназванная сила»: *«Дорогому Нафтолю — сто лет жизни нам на радость. Твой И. Шкляревский 8/11-78 г.».*

Паэт быў чалавекам закрытым, нешматслоўным, але эпітэты ў дарчых подпісах гавораць самі за сябе.

ЛЮСТЭРКА ЛЁСУ

# АЛЯКСАНДР РАДЗЬКОЎ

## Гарады

Асабістыя ўражанні

## Ад перакладчыка

*Аляксандр Міхайлавіч Радзькоў — сталы аўтар «Маладосці», газет «Звязда», «СБ. Беларусь сегодня», «Літаратура і мастацтва», «Настаўніцкай газеты». Выступае на старонках гэтых выданняў з артыкуламі, гутаркамі. І яшчэ згаданыя газеты і часопіс «Маладосць» з зайздроснай перыядычнасцю прадстаўляюць чытачу ўрыўкі з яго новых кніг. Публіцыст, вучоны, грамадскі і палітычны дзеяч заўжды імкнецца данесці да чытача ўласны погляд на рэчаіснасць, погляд, за якім паўстае багаты жыццёвы досвед чалавека і пісьменніка нераўнадушнага, шчырага і адкрытага ў сваіх ацэнках часу ды самых розных падзей. Зараз увазе чытачоў «Маладосці» мы прадстаўляем старонкі новай публіцыстычнай кнігі Аляксандра Радзькова «Гарады». У хуткім часе яна пабачыць свет у адным з выдавецтваў краіны.*

## Прадмова

Жыццё кожнага чалавека так ці іначай звязана з вялікімі і малымі гарадамі, айчыннымі і замежнымі, правінцыйнымі і сталічнымі. Нават калі ты нарадзіўся ў вёсцы, з часам зразумееў, што жыццё ў сельскай мясцовасці табе генетычна блізкае і па ўсіх накірунках прыцягальнае, усё адно не абыдзешся без горада. Туды абавязкова давядзецца з'ездзіць па розных неадкладных справах, ці проста на экскурсію, за нейкай патрэбай, ці на вучобу для атрымання прафесіі, ці, нарэшце, паглядзець, як уладкавалі сваё жыццё твае дзеці. Прыцягальнасць і магчымасці гарадскога жыцця рана ці позна выцягнуць з родных вясковых мясцін калі не цябе, дык тваіх дзяцей ці ўнукаў. Магчыма, не ўсіх, але абавязкова выцягнуць. Асабліва калі гораду раптам спатрэбіліся ў вялікай колькасці працоўныя рукі, там вырашылі разгарнуць будаўніцтва буйнога завода, як, напрыклад, аўтамабільнага ў Мінску ці хімічнага ў Магілёве.

Калі ж ты нарадзіўся ў горадзе, то адразу пранікнуты дынамікай яго жыцця — інтэнсіўнымі стасункамі, высокімі хуткасцямі перамяшчэнняў, уяўным адчуваннем натуральнага адбору пры пошуку свайго месца ў грамадстве. Ты ў гэтай дынаміцы з самага пачатку жывеш і адмаўляцца ад яе ўжо не здольны. Таму гараджане рэдка ад'язджаюць жыць у вёску, а вось адток вясковага люду ў горад не спыняецца.

Я гарады пазнаваў і асвойваў паступова, паслядоўна і... няпроста. Да сямі гадоў жыў з бабуляй у зусім невялікай, але вельмі прыгожай вёсачцы. Яна размяшчалася на высокім беразе Дняпра з яго імклівай плынню, ціхімі старымі рэчышчамі і неабсяжнымі заліўнымі лугамі. Сядзець на высокім беразе і проста глядзець на гэтую невымоўную прыродную прыгажосць быў на той час самы прыцягальны для мяне занятак.

Пасля сямі гадоў бацькі забралі мяне да сябе. У рабочы пасёлак торфапрадпрыемства «Чырвоная Беларусь», што зусім побач з горадам Быхавам. Ужо першае наведванне гэтага пасёлка мяне агаломшыла. Найбольш — багаццем яркага электрычнага асвятлення. Мы ж з бабуляй жылі пры газавай лямпе, а тут вечарам і ноччу ў кватэры і нават на вуліцы гэтак жа светла, як днём. А пры ўездзе ў пасёлак усіх сустракае высокая, ілюмінаваная электрычнымі лямпачкамі арка.

У тым пасёлку маё дзіцячае ўяўленне таксама ўразілі двухпавярховыя дамы, роўныя і шматлікія вуліцы, мноства аўтамабіляў, трактароў і зусім незнаёмай мне тэхнікі, чыгуначная вузкакалейка з акуратнымі вагончыкамі, вялікі клуб з

кіназалай, парк з танцпляцоўкай і духавым аркестрам, пяць профільных крам, вялікая сталовая, добраўпарадкаваны і дагледжаны стадыён, прыгожая двухпавярховая белакаменная школа, кіёск, у якім дарослым налівалі піва, а дзецям накладвалі марозіва ў хрумсткія вафельныя стаканчыкі.

Пасля маёй маленькай і небагатай вёскі Вотня пасёлак Чырвоная Беларусь мне падаўся казкай. Але гэта ж яшчэ не горад! Мае бацькі, як і ўсе жыхары пасёлка, трымалі карову, свіней, курэй і гусей, садзілі бульбу. Вакол пасёлка быў прыгожы і багаты на ягады і грыбы лес. Для дзетвары, нягледзячы на занятасць хатняй гаспадаркай, поўнае раздолле. Наш рабочы пасёлак займаў прамежкавае месца паміж горадам і вёскай, а горад ужо клікаў, уяўна паказваў свой маштаб і таямнічую прыцягальнасць. Старажытны беларускі горад Быхаў быў за дзесяць кіламетраў ад нас, і там з аэрадрома ўздымаліся магутныя ракетаносцы, якія пасля выканання заданняў заходзілі на пасадку прама над нашым пасёлкам. Вось Быхаў і стаў для мяне першым горадам, з якім я пазнаёміўся. Пасля былі Жодзіна, дзе працаваў старэйшы брат, затым горад вучобы і працы Магілёў, за ім — горад армейскай службы Мінск, пасля гарады навуковых канферэнцый, наведванне гарадоў па абавязку дзяржаўнай службы, падарожжы ў час адпачынку, паездкі да родных і сяброў...

Некаторыя гарады, на жаль, толькі прамільгнулі. Але шмат аказалася і такіх, якія запалі ў памяць сваім каларытам, гісторыяй, знакамітымі мясцінамі, помнікамі і, канешне ж, людзьмі. Мне захацелася расказаць пра гарады, якія сталі для мяне блізкімі. Пра тое, чым яны мне запомніліся, чым да гэтай пары ўражваюць: старажытнай гісторыяй ці рэдкім помнікам культуры, цікавай для мяне падзеяй ці сустрэчай з незвычайным чалавекам, нязбыўнай марай ці вынікам дзелавой сустрэчы. Буду рады, калі мае апавяданні пра гарады майго жыцця падштурхнуць чытача да ўласных успамінаў пра гэтую канцэнтрацыю чалавечага жыцця ва ўсіх яго праявах.

## Порт-Артур

Гэты горад я ніколі не бачыў. Але ён для мяне першапачатковы, я там быў зачаты!

У юнацтве вельмі любіў слухаць Сяргея Пятровіча Капіцу ў навукова-папулярнай тэлеперадачы «Відавочнае — неверагоднае». Аднойчы ён са шчырым захапленнем расказваў пра зараджэнне жыцця:

— Вось уявіце, што з навакольнай прасторы — з атамаў паветра, вады, прадуктаў харчавання і яшчэ шмат з чаго — раптам збіраецца зачатак. Пасля боскі подых і — новае жыццё!

Вось мяне і сабралі з атамаў горада Порт-Артура.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, мой дзядуля Еўдакім Свірыдавіч Дзергачоў сваю сям'ю — жонку і траіх дзяцей, дзе старэйшым дзіцем была мая пятнаццацігадовая мама — з Кранштата (ён там служыў) здолеў перавезці ў Вотню, пад Быхаў. Быў упэўнены, што ў вёсцы ў час вайны большая верагоднасць застацца жывымі. Аказаўся правым, сам загінуў пад Ноўгарадам, а ўся яго сям'я здолела выжыць, хаця і нацярпелася ваеннага ліха.

Мама ў вёсцы падрасла, раззнаёмілася з маладымі патрыётамі і ў шаснаццаць гадоў пайшла ў партызанскі атрад. Пасля вызвалення Беларусі ад фашыстаў іх атрад уліўся ў Чырвоную армію, і мама ў складзе ваеннага шпіталя дайшла да Прагі. Адтуль пасля капітуляцыі Германіі іх армію перакінулі на Далёкі Усход, у Маньчжурыю, для знішчэння Квантунскай арміі. Пасля яе разгрому нашы войскі размясціліся гарнізонам і ў Порт-Артуры. Мама выйшла замуж за афіцэра-сувязіста штаба арміі, у 1947 годзе ў іх нарадзіўся мой старэйшы брат Уладзімір.

Мама расказвала пра жыццё ў Порт-Артуры з натхненнем. Перамогшы ў страшнай вайне, моладзь, якая выжыла, прагна ўбірала ў сябе мірнае жыццё — яны збіраліся сяброўскімі кампаніямі, спявалі песні пад акардэон, на якім выдатна іграў бацька, танцавалі. Афіцэры былі добра адукаванымі, вывучалі гісторыю горада, ганарыліся яго гераічным мінулым.

# КСЕНІЯ ЗАРЭЦКАЯ

## Штучнае мастацтва, ці Як наша жаданне бачыць сэнсы іх знішчае




Беларусы павернутыя на тэатры. Напэўна, можна назваць гэта сцвярджэнне спрэчным і суб’ектыўным, ну дык і тэкст ніжэй будзе поўны менавіта такіх, суб’ектыўных, ацэнак, таму давайце з гэтым пагодзімся. Пра нешта ж гавораць і кіламетровыя чэргі ў Тэатр лялек, і немагчымасць купіць квіткі на некаторыя пастаноўкі, і сотні тысяч падабаек на роліках з нарэзкамі з беларускіх спектакляў пад трывожную музыку. Увогуле, калі беларус, хоць трохі зацікаўлены ў мастацтве, бачыць у афішы прэм’еру, ён купляе білет. Нават калі спектакль не тэатрам прадстаўляецца, а асобным аўтарам. Нават калі інфармацыі пра яго — кот наплакаў. Трэба ж адукоўвацца? Трэба!

### Космас і выпяндрож

Калі мне было 15 гадоў, я захапілася космасам і выпендражом перад аднакласнікамі. Не ведаю, якое з захапленняў было дамінуючым, але ў той перыяд я для прышпілу вывучыла дакладную адлегласць ад Зямлі да Месяца — 384 467 км. Дарэчы, яно ніколі не даводзілася, таму я проста хадзіла і фарсіла гэтым веданнем не да месца. А нядаўна — упершыню ў жыцці — яно спатрэбілася. На монаспектаклі «Грамадзянін Месяца» Аляксея Кулакова. І таксама, як спатрэбілася: Аляксей гэты факт згадаў, а я радасна паківала. Успомніла. І выпяндрож, і захапленне космасам.

Спектакль — не спектакль. Аляксей у самым пачатку кажа: «Тут няма рэжысёра, няма драматурга, няма мастака». Шмат каго няма, а што ёсць? Вершы. Маленькія разважанні пра жыццё, якія перасякаюцца з фразамі касманаўтаў, і не важна, Армстранга, што на Месяц ступаў, або Гагарына, што правёў на арбіце крыху менш за дзве гадзіны. Усе яны гаварылі аб адным: людзі — усюды людзі, і яднанне з чалавечым родам і з домам — Зямлёй — вастрэй за ўсё адчуваецца з вышыні. Калі межаў няма. І гравітацыі няма. Калі ляціш, як можна думаць пра дрэннае?

Калі сядзіш у глядзельнай зале, пра дрэннае якраз думаецца актыўна. Яшчэ пра падман: навошта, уласна кажучы, мы ўсе сюды прыйшлі? За монаспектаклем, відавочна. Аднак «Грамадзянін Месяца» — не спектакль. Няма ў ім сюжэта, няма герояў, ёсць толькі ідэя. Як важна жыць у міры з сабой і з іншымі. На сцэне — чорная тканіна, якая ілюструе школьную дошку, і на ёй Аляксей мелам піша назвы глаў, малюе чалавечкаў, сонца і воблачка. Каб больш зразумела было. На сцэне — гермашлем, апранаючы які можна адмовіцца ад рэчаіснасці і дакрануцца да сябе сапраўднага. На

сцэне — плед, і ён, і піжамныя штаны на Аляксеі, і мяккае святло, і соулавая музыка, і нават відэапраекцыя касмічнай прасторы — усё стварае адчуванне дома.

Толькі дома чужога, а таму ў ім некалькі некамфортна. Вершы — рэч інтымная, іх адчуваць трэба, а не слухаць. І быццам у сучасных спектаклях можна і трэба разбураць чацвёртую сцяну, і гадаць па старонках для гледачоў можна, і «будзь здаровы», перарываючы дэкламацыю, казаць таксама можна. І ўсё ж «Грамадзянін Месяца» — не спектакль, а паэтычны вечар.

Пра космас на ім думалася мала. Пра мір ва ўсім свеце — таксама. Думалася пра сябе пятнаццацігадовую, якая любіла вершы і выпяндрож. Яна была б у захапленні.

## Творчасць і маркетынг

Вядома, Аляксей наўрад ці спецыяльна вырашыў падмануць аўдыторыю. Яму проста прыйшло ў галаву прыгожае абазначэнне формы. Людзі хутчэй прыйдуць менавіта на спектакль, чым на паэтычны вечар. І ездзіць пастаноўка па гарадах, прычым не толькі беларускіх, але і замежных, і збірае залы: хай няпоўныя, але, відавочна, дастатковыя для працягу дзейнасці. А пасля — прадаюцца кнігі аўтара. Гэта добрая маркетынгавая стратэгія: у пачатку вечара Аляксей варожыць для аўдыторыі па ўласным зборніку вершаў. Так і сувязь з публікай выбудоўваецца, і цікавасць да творчасці абуджаецца: радкі ж прыгожыя.

Аднак у любога, хто прыйшоў менавіта на спектакль, адразу паўстане пытанне: чаму дзеянне такое не адхіленае? Як бы пафасна гэта ні гучала, на сцэне адбываецца магія. І для акцёра, наогул, значна складаней паўстаць перад публікай у неабходным вобразе, калі яна, публіка, ведае яго асабіста. Таму і разважаем мы пра шкоду блізкасці творцы з аўдыторыяй у сацыяльных сетках: раніцай назіраеш у сторыз, як акцёр сабе каву варыць, а ўвечары павінен паверыць у яго смерць на сцэне. Тэатр — мастацтва мімалётнае, аднаразовае. Як толькі святло выключаецца і гучыць трэці званок, мы павінны бачыць не чалавека перад сабой, але героя. У «Грамадзяніне Месяца» перад намі толькі чалавек. І гаворка нават не пра тое, што першыя пятнаццаць хвілін дзейства ён быў чалавекам-стваральнікам прадстаўлення. Хутчэй пра тое, што ён застаўся ім пасля пачатку.

Перад гледачамі ўзнікае персона пяшчотная, пачуццёвая, манерная, якая з трапятаннем адносіцца што да слоў сваіх, што да сэнсаў, у іх закладзеных. І менавіта з-за асабістай сувязі аўтара і яго вершаў, для нас, гледачоў, там не засталося месца.

## Новая шчырасць

Такім чынам, «Грамадзянін Месяца» апынуўся няздольны ўзяць аўдыторыю ні сцэнаграфіяй, ні сюжэтам, ні тэкстам. Ці быў у спектакля хоць нейкі шанц? Мне здаецца, так. І шанц гэты заключаўся ў прыватнасці.

Мы жывём у эпоху поўнай шчырасці. Дзякуючы тым жа сацыяльным сеткам, мы пранікаем у асабістае жыццё іншых людзей, бачым не толькі іх радасць, але і іх слёзы, перажыванні і трагедыі. І новы вопыт судакранання з лёсам незнаёмага чалавека прымушае нас далучацца да яго перажыванняў на эмацыйным узроўні. Перажываць за яго, суперажываць яму.

***Новая шчырасць — гэта трэнд XXI стагоддзя, рух, які акцэнтуе ўвагу на сумленнасці, простасці і непадробленасці ў выразе пачуццяў, думак і ідэй. У адрозненне ад папярэдніх эпох, дзе панавалі іронія, сарказм, постмадэрнісцкая гульня з формай і дыстанцыяванасць, новая шчырасць прапагандуе шчырасць як каштоўнасць, якая дапамагае ўсталяваць больш глыбокую, сумленную сувязь паміж стваральнікам і аўдыторыяй.***

Аднак для таго, каб «падключэнне» здарылася, неабходна хоць нешта ведаць пра чалавека. Гэта могуць быць нязначныя, маленькія дэталі. Галоўнае — асабістыя. Пасля «Грамадзяніна Месяца» той глядач, які не ведаў Аляксея да спектакля, так і застаўся ў недасведчанасці аб тым, хто ж ён такі — рэжысёр-стваральнік Аляксей Кулакоў. Прытым што афіша

# ЯЎГЕНІЯ ЛЯЗО

## Шкло, святло і робаты




Вазьмі сваю свяцільню / уклад. і аўт. уступ. артыкулаў А. М. Карлюкевіч. — Мінск : Аверсэв, 2025. — 318 с. : іл. — (Сучасная беларуская літаратура).

Зборнік «Вазьмі сваю свяцільню» склалі разнастайныя па жанры творы маладых пісьменнікаў. Выхад кнігі забяспечвае літаратурны працэс новымі імёнамі, дае магчымасць патэнцыяльнаму чытачу пазнаёміцца з творамі маладых аўтараў, засяродзіць увагу на пэўным пісьменніку і пачаць сачыць за выхадам яго твораў. Для агляду падбіраліся розныя па жанры творы, каб чытач мог уявіць плюралізм і ўнікальнасць творчасці маладых аўтараў.

Кніга пачынаецца гумарыстычнай аповесцю *Андрэя Сідарэйкі «Маладыя, альбо Вясёлыя будні сям'і Курачкіных»*. Твор даволі просты па змесце, бо ён планаваўся як «міні-серыял». Аповесць складаецца з маленькіх гісторый, якія можна чытаць у любым парадку. Галоўныя героі — Міша і Маша, маладыя муж і жонка, што сутыкаюцца з рознымі побытавымі канфліктнымі сітуацыямі і пераадольваюць іх. Верагодна, аповесць была разлічана на шырокае чытацкае кола, бо выпадкі будуць знаёмыя многім людзям. Таму вобразы персанажаў да простасці тыповыя і канфлікты прадказальныя. Міша мае дастаткова стэрэатыпныя «мужчынскія» навыкі: умее рамантаваць сантэхніку, разбіраецца ў машынах, ходзіць на рыбалку. А Маша робіць па гаспадарцы «жаночыя» справы, даглядае сябе. Адметнасцей у занятках мы не сустракаем, іх цікавасці ўсярэднены.

Характары — таксама. Усе канфлікты вырашаюцца без вялікіх страт і намаганняў, таму адносіны персанажаў не развіваюцца. У аповедзе «Неверагодная шчодрасць» расказана, як Міша патраціў амаль усю зарплату на ўласныя інтарэсы, за што Маша прыгразіла мужу пакінуць сям'ю. Але засталася, бо Міша выйграў у латарэі. На працягу ўсёй аповесці героям падазрона многа шанцуе. З'яўляецца deus ex machina[1] — аўтар «выблытвае» героя з цяжкіх абставін, а не шукае шляхі росту персанажа.

Маша таксама стварала праблемы. З аповеда «За імгненне да гадзіны ікс» чытаем, як дзяўчына пазнаходзіла мужавы заначкі і патраціла грошы на свой знешні выгляд. Міша не абураецца, а карыстаецца сітуацыяй: ставіць жонку перад фактам, што замест дачы едзе на рыбалку і ў лазню. Маша пагаджаецца. Адмяняе сваю згоду толькі тады, калі маладым людзям паступілі на картку грошы. Ізноў з'яўляецца deus ex machina: аўтар замест таго, каб развіць канфлікт і прымусіць герояў думаць над шляхам выратавання са складанай фінансавай сітуацыі, шчодра пералічвае персанажам грошы.

---

[1] Бог з машыны *(лац.)*.

# АНКЕТА «МАЛАДОСЦІ»



Мікалай Мікуліч, літаратуразнаўца, літаратурны крытык, дацэнт Інстытута літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, кандыдат філалагічных навук

1. *Кім вы хацелі стаць у дзяцінстве?*
2. *Як адчулі першы покліч да пісьменства?*
3. *Ці любіце кінематограф (любімы фільм, рэжысёр)?*
4. *Якія станоўчыя якасці ў чалавеку найбольш цэніце?*
5. *Ваш любімы паэт, пісьменнік, кампазітар, мастак?*
6. *Якія чалавечыя рысы не церпіце?*
7. *Ваш любімы занятак у вольны час?*
8. *Чаго вы яшчэ хацелі б у жыцці дасягнуць ці дачакацца?*
9. *Ваша любімая пара года?*
10. *Любімая расліна?*
11. *Ці падабаецца вам ваша імя?*
12. *Ваша любімая страва?*
13. *Як вы разумееце шчасце, шчаслівы лёс?*

**1.** Дакладна памятаю, дзесьці яшчэ ў сярэдніх класах мне хацелася стаць дырэктарам школы. Не настаўнікам, а менавіта дырэктарам. Гэта было такое выразнае і даволі працяглае хаценне, якое перыядычна напамінала пра сябе самымі living матывамі і адценнямі. Справа ў тым, што мне падабаўся тагачасны дырэктар нашай школы, яго неяк усе — і вучні, і настаўнікі — асцерагаліся, паважалі і баяліся. Аўтарытэт дырэктара ў калектыве, памятаецца, быў неаспрэчным. Прываблівалі, як сёння модна казаць, сама методыка яго працы як менеджара, якая трывалася на тлумачэннях і перакананнях, характар узаемаадносін з калегамі і выхаванцамі, якія ён прапаноўваў ці сцвярджаў. Працаваў неяк няспешна, някідка, без шумных заўваг і ўшчуванняў, як вядома, даволі распаўсюджаных у школах і сёння, без гучных распараджэнняў, якія зазвычай сеюць напружанасць і неспакой, але ўнутрана эфектыўна, дзейсна, прадуктыўна. Не было бачна, што, дзе, з чым звязана, адкуль што ідзе, аднак кожны ведаў сваё месца, усе дэталі механізма функцыянавалі, дзейнічалі, працавалі на вынік.

Я меркаваў: стану настаўнікам, вядома, беларускай мовы і літаратуры, ствару сям'ю, пушчу, як кажуць, жыццёвыя карані, даслужуся да пасады дырэктара. Буду лавіць рыбу ў недалёкай Вялікай Выны, яе копанках і тапіле пад лесам, якой там заўсёды хапала, хадзіць на паляванне (навокал раскінуліся такія лясы!), буду наведваць у сталіцы тэатры, выстаўкі, музеі, футбольныя і хакейныя матчы. Адным словам, меркаваў жыць актыўным, насычаным, паўнакроўным, цікавым жыццём вясковага інтэлігента, патрыёта сваёй зямлі.

**2.** Не ведаю, гэта ўжо быў «покліч да пісьменства» ці проста сімпатыя, схільнасць да развагі, аналізу, творчага дыскурсу, але ў школе мне падабаліся пісьмовыя работы па літаратуры — пераказы і сачыненні (у тым ліку і на вольныя тэмы), дзе цаніліся не столькі інфармацыйны досвед і фактурна-падзейная абазнанасць, як творчае мысленне і фантазія. Гэты